Сувязь пакаленняў

01.07.2022 - 10:01 Культура

Пра радзіму, патрыятычныя арыенціры і захаванне гістарычнай памяці гаворым з групай “Аўра” — сямейнатворчым тандэмам спявачкі і паэтэсы Юліі БЫКАВАЙ і кампазітара музыканта Яўгена АЛЕЙНІКА.



— Як лёс вашай сям’і пераплецены з гісторыяй нашай краіны?

Яўген. Мой прадзед па матулінай лініі Пётр Атрасевіч удзельнічаў і ў Першай, і ў Другой сусветных войнах. Быў прызнаны загінуўшым, і пахавальны ліст адпраўлены родным. Аднак калі пахавальная брыгада абходзіла загінуўшых на полі бою, паднеслі да яго носа люстэрка, і яно запацела. Яго адправілі ў тыл у Казахстан, а пасля вайны медсястра, якая яго лячыла, адвезла да родных. І хоць бабуля разам са сваёй маці аплакалі яго, ён вярнуўся і нават мяне яшчэ на руках калыхаў. Дарэчы, прадзед — пляменнік вялікага рускага тэнара Івана Казлоўскага, магчыма, ад яго я атрымаў у спадчыну музычныя здольнасці і яркі тэмперамент.

Бабуля Надзея Пятроўна Атрасевіч была вязнем канцлагера, збегла адтуль. Паўгода прабіралася праз польскія лясы, дабегла да Буга, дачакалася

Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайтам nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп’ютары.

Ok Падрабязней.

яго вызваленне. Пасля вайны займаўся размініраваннем беларускага Палесся.

Бабуля і дзядуля ажаніліся праз тры гады пасля вайны. Нарадзілі дваіх дзяцей і пражылі шчасліва амаль 60 гадоў. Пра вайну ўспаміналі вельмі рэдка, і толькі бабуля за некалькі гадоў да смерці рашылася напісаць пра тое, як яе, пятнаццацігадовую дзяўчынку, фашысты забралі ў канцлагер. Свае рукапісы яна перадала мне, зараз я іх захоўваю як сямейную рэліквію.

Юлія. Вялікая Айчынная вайна не прайшла міма ніводнага беларуса. Дзядуля Васіль Ігнацьевіч родам з-пад Мінска. А бабуля Ніна Мікалаеўна — з пасёлка Чашнікі Віцебскай вобласці. У іх амаль 10 гадоў розніцы. Бабуля ў час вайны была зусім малой. Калі вайна скончылася, ёй споўнілася ўсяго толькі дзесяць.

Дзядулю на момант вызвалення Беларусі ў 1943 годзе было 18 гадоў. Ён пайшоў на фронт на Захад і вызваляў Польшчу, атрымаў там сур'ёзнае раненне і кантузію. Яго адправілі ў тыл, дзе цудам выратавалі нагу, але ўсё роўна ён застаўся інвалідам. Пасля вайны сустрэў сваю любую Ніну. Ажаніліся, выхавалі дваіх дзяцей, пражылі доўгае шчаслівае жыццё. Дзядуля не любіў расказваць пра подзвігі, хоць меў ордэн Чырвонай Зоркі і медаль "За адвагу". Бабуля таксама мала расказвала, зрэдку магла ўзгадаць пра здзекі над людзьмі, пра забойствы дзяцей, і як яны, каб выжыць, смакталі камяні. Але, нягледзячы ні на што, выжылі. Для бабулі і дзядулі Дзень Перамогі заўсёды быў адным з самых галоўных свят.

> ***27 чэрвеня кампазітар і прадзюсар Яўген Алейнік стаў заслужаным дзеячам мастацтваў Беларусі.***

Мы выкарыстоўваем файлы "cookies" і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайтам nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп'ютары.

Ok Падрабязней.

дзі, разумныя, спакойныя, руплівыя і крыху асцярожныя. Будзем спадзявацца, што наш народ і далей будзе падтрымліваць свой імідж, у аснове якога стабільнасць, міралюбнасць і павага да гісторыі.

— У якіх мясцінах абавязаны пабываць кожны беларус?

Яўген. На могілках сваіх продкаў і ў тых мясцінах, куды яго душа завядзе. А яшчэ кожны беларус павінен сачыць, каб вакол яго было чыста і прыгожа.

Юлія. Мемарыялы абавязковыя для наведвання. Хатынь, Чырвоны Бераг, Трасцянец, Азарычы, брацкія магілы, абеліскі… — магу доўга пералічваць, бо каля кожнага населенага пункта ёсць такія месцы. Калі чалавек прыязджае ў Беларусь, то яго неабходна азнаёміць не толькі з нашымі знакамітымі помнікамі архітэктуры, нацыянальнымі традыцыямі, цудоўнымі маёнткамі, але і з месцамі памяці. Лічу, што іх абавязкова трэба ўключыць у экскурсійныя маршруты па нашай краіне, бо менавіта яны дапамогуць зразумець, што перажылі беларусы і чаму мы сёння такія.

— Яўген, Юлія, ведаю, што вы абое карэнныя мінчане. Падзяліцеся, калі ласка, вашымі самымі цёплымі ўспамінамі, звязанымі са сталіцай.

Яўген. У кожнага чалавека самыя яркія ўспаміны звычайна звязаны з месцам, дзе ён вырас. Наша малая радзіма — сталічныя мікрараёны, у якіх прайшло наша дзяцінства: Масюкоўшчына — мая, Серабранка — Юліна. Там, у хрушчоўскіх 5-павярхоўках прайшлі самыя першыя гады нашага жыцця. Калі мы рыхтавалі альбом “Куточак Беларусі”, то шмат гаварылі пра гэта. Увогуле, беларусы падвержаны і вучэбнай, і працоўнай міграцыі, мы ўсе пастаянна некуды пераязджаем. Таму ва ўсіх беларусаў ёсць сталіца альбо вялікі горад, дзе яны жывуць зараз, і ёсць малая радзіма, дзе прайшло іх дзяцінства.

Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайтам nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп’ютары.

Ok

Падрабязней.

вуліцы, я адчуваю, як нешта шчыміць унутры. Люблю гуляць па Мінску, каля сваёй школы, там, дзе з Жэнем жылі, ля медінстытута.

— Што для вас Год гістарычнай памяці? У якіх мерапрыемствах, прымеркаваных да яго, паўдзельнічаеце?

Яўген. Я цалкам перакананы: для людзей, якія ў штодзённай мітусні штосьці забылі, гэты год стане добрым напамінам, каб яны не нарабілі новых памылак. Гэта мой год, і я вельмі рад, што тэматыка Вялікай Айчыннай вайны зараз на парадку дня, што помнікі аднаўляюцца і героі шануюцца, — мне гэта ўсё па душы.

Юлія. Мы ўдзельнічаем у шматлікіх рэспубліканскіх і дзяржаўных мерапрыемствах. Акрамя іх, на 16 лістапада запланаваны вялікі сольны канцэрт групы “Аўра” ў Палацы спорту. У нашым рэпертуары вялікае месца займае патрыятычная тэматыка, у нас шмат душэўнай і шчырай музыкі. Калі ты робіш тое, што любіш, то і вынік атрымліваецца адпаведным.

На сольніку мы выканаем як даўно любімыя гледачамі песні, напрыклад, “Родники”, “Куточак Беларусі”, “Любимую не отдают”, “Затрымай мяне”, “Синеокая”, так і кампазіцыі, якія рэдка выконваем.

Яўген. Наш канцэрт будзе гучным, яркім, энергічным, драйвовым. Мы чакаем шмат патрыётаў, каб спець разам нашы песні, патанцаваць, перадаць энергію і чарговы раз аб’яднацца. Час дыктуе свае законы, таму наш канцэрт будзе моцна патрыятычным і пры гэтым моцна энергетычным. Запрашаем усіх!

Вольга АНТОНЕНКАВА.
Фота з асабістага архіва групы “Аўра”.

Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайтам nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп’ютары.

Ok Падрабязней.

Услед за марай

27.01.2023

Сустрэча-падзяка

17.01.2023

НОВОСТИ

Якія патрыятычныя праекты аб’ядноўваюць навучэнцаў сярэдняй школы № 3 Гродна, расказала Алена Ермашкевіч

Дэвіз «Мы разам — поспех» яшчэ ніколі не падводзіў дырэктара Гарбавіцкай сярэдняй школы Аксану Раманаву

«Я прарасту любоўю да Радзімы» — дэвіз педагога Аляксандра Зайкі, імя якога носіць Косаўская сярэдняя школа

Адпачынак без слязінак. МНС нагадала, як зрабіць летнія канікулы бяспечнымі

«Вучыцца далей буду ў Беларусі». Якія планы ў 400-бальніка Дзяніса Кагукіна з Полацка

АВТОРСКИЕ КОЛОНКИ

НАТАЛИЯ БУШНАЯ




Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайтам nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп’ютары.

Ok

Падрабязней.

СІЛА РОДНАЙ ЗЯМЛІ



©2014-2023 Редакционно-издательское учреждение «Издательский дом «Педагогическая пресса»

Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайтам nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп’ютары.

Ok

Падрабязней.